# Нас аб'яднала мудрасць кніг

М. ЁЖ
бібліятэкар
2 катэгорыі дзіцячага
філіяла Гродзенскай
абласной
навуковай бібліятэкі
імя Я. Ф. Карскага

## Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага

**Мы жывем у час новых тэхналогій. Тэлебачанне, радыё, Інтэрнэт — гэтыя сродкі масавай інфармацыі сталі неад'емнай часткай жыцця сучаснага чалавека. І здаецца, што ў гэтым патоку зусім не засталося месца для кнігі. Няўжо яна аджывае свой час?**



**Не!** Чытанне яшчэ вельмі актуальнае, і кніга будзе жыць доўга. Аб'яўленне 2012 года ў Рэспубліцы Беларусь Годам кнігі падкрэсліла значнасць і ролю кнігі ў нашым грамадстве. Яна аказвае вялізны ўплыў на чалавека, дапамагае вучыцца, пашырае кругагляд, лечыць душу, узбагачае жыццёвы вопыт, фарміруе погляды і характар. У гэтым яе цудадзейная сіла.

У Год кнігі дзіцячы філіял Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага актыўна ўдзельнічае ў акцыях і мерапрыемствах па прапагандзе кнігі, папулярызацыі чытання, нацыянальнай культуры і літаратуры. Менавіта з мэтай заахвочвання падрастаючага пакалення да чытання ў філіяле на пачатку 2012 года быў арганізаваны падлеткавы клуб «Равеснік», удзельнікамі якога сталі вучні 6–9 класаў агульнаадукацыйных школ г. Гродна — самыя актыўныя чытачы бібліятэкі. «Нас аб'яднала мудрасць кніг» — такі дэвіз аматарскага аб'яднання. Сапраўды, клуб аб'яднаў вельмі цікавых, творчых, разумных і таленавітых падлеткаў, якія імкнуцца да ведаў, хочуць праявіць сябе, раскрыць свае здольнасці. Мэта стварэння клуба — гэта не толькі арганізацыя вольнага часу, фарміраванне культуры чытання, але і дапамога ў развіцці камунікатыўных зносін, выхаванне творчых здольнасцяў, маральных якасцяў і ўстойлівай жыццёвай пазіцыі падлеткаў.

Праграма клуба «Равеснік» была распрацавана на аснове аналізу чытацкіх запытаў і анкетавання ўдзельнікаў. Адным з асноўных накірункаў работы з'яўляецца выхаванне ў маладога пакалення пачуцця захаплення мастацкім словам і ўмення параўноўваць, аналізаваць, рабіць высновы на прыкладзе канкрэтных літаратурных твораў. Самымі эфектыўнымі формамі дзейнасці клуба «Равеснік» з'яўляюцца дыспуты, мультымедыйныя прэзентацыі, круглыя сталы. Падлеткі самастойна выбіраюць тэмы для абмеркавання, што сведчыць аб шчырай зацікаўленасці ў актыўным удзеле ў паседжаннях аматарскага аб'яднання. Найбольш цікавымі і запамінальнымі паседжаннямі сталі: інтэрактыўная гульня «Я — дома, я — у школе, я — сярод сяброў», забаўляльна-пазнавальнае шоу «Сем цудаў свету», інтэграваная гутарка «Вялікае падарожжа Дж. Р. Толкіена. Поўная гісторыя Міжзем'я». Усе сустрэчы праходзяць у прыемнай нязмушанай атмасферы, што дае магчымасць узаемадзейнічаць з усімі прысутнымі, развіваць у іх навык разважання і вядзення гутаркі.

2012 год вельмі шчодры на знамянальныя даты, сярод якіх найбольш важнай з'яўляецца 130-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. У клубе «Равеснік» прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя класікам беларускай літаратуры. Асабліва запамінальным стала абмеркаванне творчасці Я. Коласа пасля прагляду спектакля «Сымон-музыка». Спектакль не мог не ўразіць: сучасная пастаноўка, гук, асвятленне і, канечне, таленавітасць удзельнікаў юнацка-драматычнага калектыву «Гродзенская надзея». Ліра-эпічная коласаўская паэма пра пошукі таленавітым музыкам праўды і сэнсу жыцця застаецца актуальнай у любы час, бо гучыць гімн непадкупнаму, бессмяротнаму мастацтву як сведчанню духоўнай сілы народа.

У бліжэйшых планах клуба «Равеснік» — творчы вечар з майстрам сцэны, актрысай Гродзенскага лялечнага тэатра Галінай Закрэўскай, літаратурна-музычная феерыя «Свечы, музыка і вершы...», віртуальная экскурсія да 90-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Крышталь душы» — адным словам, шмат цікавых, незабыўных сустрэч. А наша, бібліятэкараў, задача — дапамагчы «равеснікам» творча самавыявіцца, адчуць задавальненне ад самастойных пошукаў і першых уласных здзяйсненняў. І няхай кніга стане для падлеткаў добрым і надзейным сябрам не толькі ў гэтым годзе, але на працягу ўсяго жыцця.